***Зміцер Крывашэй (Менск),***
*кандыдат гіст. навук,*
*ст.выкладчык Інстытута кіравання*

# Архіўныя крыніцы па гісторыі нацыянальных супольнасцяў Беларусі ў 1941 – 1944 гг.

Сярод шматлікага комплексу архіўных дакументаў перыяду нямецкай акупацыі Беларусі практычна без увагі даследчыкаў застаюцца дакументы, якія дазваляюць часткова рэканструяваць гісторыю нацыянальных супольнасцяў нашай краіны. Да найбольш шматлікіх з іх мы адносім палякаў, украінцаў, рускіх, літоўцаў, латышоў, цыганоў, “народных немцаў” (фольксдойч).

Увесь комплекс дакументаў названых архіваў па акрэсленай праблеме можна падзяліць на некалькі груп:

1. Дырэктыўныя дакументы (у прыватнасці, дакументы рэйхскамісарыятаў “Остланд”, “Украіна”, рэйхсміністэрства па занятым усходнім абласцям, дакументы правінцыі “Усходняя Прусія”, Генеральнага камісарыята “Беларусь”, уездных, акруговых і гарадскіх камісарыятаў, раённых управаў).
2. Справаздачы.
3. Статыстычныя дакументы.
4. Кадравыя дакументы: картатэкі, анкеты, спісы.
5. Аўтабіяграфіі.

Агульнае ўяўленне пра колькасць і тэрытарыяльнае размяшчэнне дадзеных груп насельніцтва даюць матэрыялы, якія тычацца перапісаў насельніцтва, што былі праведзены восенню 1941 і вясною 1943 г. Напрыклад, сярод матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Менскай вобл. (далей ДАМВ – *З.К.*) захоўваецца загад камісара Менскай акругі раённым бургамістрам ад 27 кастрычніка 1941 г. пра неабходнасць “зараз жа ўстанавіць з якіх народнасцей складаецца насельніцтва паасобных раёнаў, менавіта, паасобку немцаў, палякаў, беларусаў, рускіх, літоўцаў, жыдоў і інш. нацыянальнасцей. Пры гэтым неабходна паасобна скласці спіс моладзі да 16 гадоў”[1]. Сярод дакументаў фонду Менскай раённай управы знаходзяцца спісы насельніцтва Менскага раёну па асобных валасцях

[1] Дзяржаўны архіў Менскай вобл. (далей ДАМВ). Ф. 623, воп. 1, ад.з. 1, арк. 127.

з пазначэннем нацыянальнасцяў (немцы, беларусы, рускія, літоўцы, палякі, жыды, іншыя) і падзелам на мужчын і жанчын, звесткі пра нацыянальны склад моладзі да 16 гадоў[2]. У асобных спісах сярод нацыянальнасцяў пазначаны татары, латышы, украінцы, чувашы, узбекі, балгары, удмурты, казахі. У ДАМВ захоўваюцца і іншыя спісы пра колькасць і нацыянальную прыналежнасць грамадзян[3]. У фондзе 623 гэтага ж вопісу захоўваецца загад камісара Менскай раённай управы ад 11 сакавіка 1943 г. старшыням валасцей пра правядзенне да 1 красавіка перапісу насельніцтва з падрабязным тлумачэннем правілаў складання і запаўнення анкетаў[4]. У фондзе Гарадзенскага ўезднага камісарыяту знаходзіцца апісанне Гарадзенскага ўезду з дадзенымі па нацыянальным складзе і колькасці насельніцтва, адказ на запыт начальніка Беластоцкага грамадзянскага ўпраўлення пра колькасны і нацыянальны склад насельніцтва Гарадзенскага ўезду (студзень 1944 г.)[5].

Звяртае на сябе ўвагу анкета, запоўненая ў верасні 1942 г. гарадзенскім уездным камісарам. У ёй закранаецца шэраг пытанняў, адказы на якія дазваляюць дэталёва аднавіць гісторыю этнічных працэсаў, якія адбываліся ў той час у краю. Апрача статыстычных звестак па колькасці карэнных немцаў, асобаў нямецкай нацыянальнасці, якія пражываюць за межамі Рэйха (фольксдойч), беларусаў, палякаў, жыдоў і літоўцаў, знаходзім звесткі з ацэнкай лаяльнасці мясцовых палякаў і беларусаў, актыўнасці насельніцтва ў справах нацыянальнага будаўніцтва, развіцця культуры, патрабаванні асобных этнічных групаў, іх узаемныя прэтэнзіі ды інш.[6]

Асобна трэба вызначыць групу дакументаў, у якую ўваходзяць спісы насельніцтва па нацыянальнасцям. Напр., у Дзяржаўным архіве Менскай вобл. захоўваюцца спісы нямецкага насельніцтва Менскага раёну на кастрычнік – лістапад 1941 г.[7] У іх прыводзяцца звесткі пра галаву сям'і і колькасць едакоў, месца жыхарства і пасаду галавы сям'і. У далейшых дакументах гэтая група насельніцтва называецца "волгадойч". У гэтым жа архіве захоўваюцца спісы фольксдойч, якія пражывалі на тэрыторыі Абчацкай воласці на 25 снежня 1941 г.[8] і на тэрыторыі Любанскага раёну на 1 траўня 1943 г.[9] Спісы складзены з пазначэннем усіх членаў сям'і, года і месца іх нараджэння, месца пражывання, нацыя-

2 ДАМВ. Ф . 623, воп. 1, ад.з. 4, арк. 74.
3 Тамсама. Ф. 1549, воп. 1, ад.з. 34, арк. 112, 116, 117; ф. 1039, воп. 1, ад.з. 35.
4 Тамсама. Ф. 623, воп. 1, ад.з. 512, арк. 57.
5 Дзяржаўны архіў Гарадзенскай вобл. (далей ДАГрВ). Ф. 1, воп. 1, ад.з. 284.
6 ДАГрВ. Ф. 1, воп.1, ад.з. 58, арк. 251 – 259.
7 ДАМВ. Ф. 623, воп. 1, ад.з. 4, арк. 171 – 176, 193 – 210.
8 Тамсама. Ф. 623, воп. 1, ад.з. 143.
9 Тамсама. Ф. 1039, воп. 1, ад.з. 22.

нальнасці (толькі ў выпадку Любанскага раёну). Спіс грамадзян нямецкай нацыянальнасці (фольксдойч), якія пражывалі на тэрыторыі Мар'інагорскага, Менскага, Смалявіцкага і Уздзенскага раёнаў, захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі[10]. Спісы ўтрымліваюць звесткі па валасцях пра месца нараджэння і актуальнае месца жыхарства, дату нараджэння, веравызнанне, спецыяльнасць фольксдойч (не ва ўсіх дакументах прысутнічаюць усе пазначаныя пазіцыі). Храналогія – 26 верасня – 21 кастрычніка 1941 г. Матэрыялы дазваляюць прасачыць рух насельніцтва, правесці аналіз па адносінам да рэлігійных культаў, даць узроставую характарыстыку. Так, толькі на тэрыторыі Смалявіцкага раёна пражывала 556 фольксдойч, у Мар'інагорскім раёне – 139, Менскім – 564. У фондзе Гарадзенскага ўезднага камісарыяту таксама ёсць аналагічныя дакументы[11]. У некаторых адзінках захавання апрача спісаў знаходзяцца анкеты фольксдойч, перапіска ў справе ўстанаўлення нямецкага паходжання[12]. Акрамя гэтага, акупацыйная адміністрацыя складала спісы нямецкіх дзяцей. У некаторых выпадках гэта было звязана з адкрыццём школ для дзяцей рэйхс- і фольксдойч[13].

Сярод матэрыялаў НАРБ захоўваецца загад Генеральнага камісара Беларусі (3 лістапада 1941 г.) абласным камісарам пра прадстаўленне звестак адносна колькасці татараў, а таксама распараджэнне дасылаць інфармацыю пра колькасць прыхільнікаў ісламу (26 лютага 1942 г.). У гэтым жа фондзе знаходзяцца справаздачы ўездных камісараў па абодвух распараджэннях, што дазваляе часткова рэканструяваць структуру татарскага насельніцтва на тэрыторыі Генеральнага камісарыяту "Беларусь" на канец 1941 – пачатак 1942 г. і мусульманскага – на вясну 1942 г. На падставе атрыманых звестак, 27 сакавіка 1942 г. у Рыгу была накіравана агульная справаздача пра колькасць прыхільнікаў ісламу ў Генеральнай акрузе "Беларусь". Справаздача не ўтрымлівае звестак з Вілейкі, Баранавіч, Ліды і Наваградку. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што ў дакуменце прыводзяцца колькасныя звесткі не пра мусульман, як пазначана ў загадзе (Betr.: Anhanger des Islams im Generalbezirk Wei?ruthenien), а пра колькасць татараў (Im einzelnen verteilen sich die Tataren auf die Gebiete in folgender Weise...). Статыстычныя звесткі пра колькасць мусульман у Вілейскім (на 6 траўня 1942 г.) і Слуцкім (на 12 лістапада 1941 г.) акружных камісарыятах знаходзяцца ў адзінцы захавання 425[14]. У спісе

[10] НАРБ. Ф. 393, воп. 4, ад.з. 6.

[11] ДАГрВ. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 188; ад.з. 571.

[12] Тамсама. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 574; ад.з. 334; ад.з. 292; ад.з. 289 а.

[13] НАРБ. Ф. 393, воп. 5, ад.з. 68; ДАМВ. Ф. 623, воп. 1, ад.з. 145; ДАГрВ. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 58.

[14] НАРБ. Ф. 370, воп. 1.

па Вілейскаму акруговаму камісарыяту звесткі прыведзены па кожнаму раёну адпаведна запыту рэйхскамісара. Дадзеныя табліцы дазваляюць атрымаць звесткі не толькі пра колькасць мусульман, але і пра іх нацыянальнасць, колькасць мячэцяў, кіраўнікоў абшчын, сувязі з замежнымі мусульманскімі краінамі, жаданне (ці нежаданне) татарскай часткі мусульманскага насельніцтва перасяліцца пасля вайны ў Сярэднюю Азію. Агульная лічба мусульман у Вілейскай акрузе складала 463 чал., у Слуцкай – 33.

Варта ўвагі, што не заўсёды мусульманамі з'яўляліся выключна татары. Напрыклад, у Радашковічах 7 мусульман запісалі сябе беларусамі, у Дзясятках такіх было ўжо 58, у Гародыках – 2, у Сафінава – 8, у Валожыне – 11, Мядзелі – 86, у Кабыльніках – 21. У Слабадзе 42 мусульманіна запісаліся палякамі. На ўсю акругу была толькі адна мячэць у Мядзелі. З данясення Слуцкага акруговага камісара даведваемся, што "татары – гэта руплівыя, працавітыя і мэтанакіраваныя людзі, якія пераважна не маюць ніякай прафесіі, а займаюцца, напрыклад, дубленнем і выдзелкай скур у сваіх хатніх майстэрнях. Яны лаяльныя і добрасумленныя і не ствараюць ніякіх складанасцяў". У іншым данясенні Слуцкі акруговы камісар прыводзіць лічбу мусульманскага насельніцтва акругі – 77 чалавек (на 17 сакавіка 1942 г.)[15].

Статыстычныя звесткі пра рускіх мы здолелі адшукаць толькі ў фондах Дзяржаўнага архіву Гарадзенскай вобл. У спісах, складзеных у сакавіку 1942 г. прыводзяцца звесткі па асобным населеным пунктам уезду пра колькасць, месца, дату нараджэння, падаюцца спісы мужчын ад 14 да 60 гадоў з пазначэннем сямейнага становішча[16].

Наступную групу дакументаў складаюць спісы, аўтабіяграфіі, анкеты і заявы супрацоўнікаў медыцынскіх установаў і школаў[17], матэрыялы валасных старшынь[18]. Сярод гэтых людзей былі прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. Анкетныя звесткі даюць уяўленне аб паўсядзённым жыцці і лёсе людзей, дазваляюць высветліць месца паходжання, веравызнанне і даведацца пра бацькоў (у некаторых выпадках – дзядоў). Спісы дазваляюць падлічыць долю прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў сярод усіх супрацоўнікаў. Праўда, пазначэнне людзьмі сваёй нацыянальнасці не было пазбаўлена пэўнага суб'ектывізму. Напр., сярод анкетаў і аўтабіяграфій настаўнікаў школ Плешчаніцкага раёна Барысаўскай акругі знаходзім выпадкі вызначэння нацыянальнасці як "каталіцкая". У адной з анкет у графе "нацыянальнасць" слова "паляк" выпраўлена на

[15] Тамсама. Ф. 370, воп. 1, ад.з. 386, арк. 23.
[16] ДАГрВ. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 58, арк. 6,11, 14 – 16, 20, 22 – 23,25.
[17] НАРБ. Ф. 393, воп. 3, ад.з. 113, 114, 117; воп. 5. Усе ад.з.
[18] Тамсама. Ф. 393, воп. 3.

“беларус”[19]. У аўтабіяграфіі іншай настаўніцы напісана “па нацыянальнасці беларус”, а ў анкеце нацыянальнасць пазначаная як “каталіцкая”[20].

Звернемся да “Спісу супрацоўнікаў гарадской аптэкі ў Нясвіжы”, які захоўваецца ў фондах Нясвіжскай раённай управы[21]. У ім даюцца падрабязныя характарыстыкі супрацоўнікаў з пазначэннем даты нараджэння, нацыянальнасці, адукацыі, лаяльнасці да ўладаў. Напрыклад, “Т-оўская [прозвішча ў этычных мэтах не называем – *З.К.*] Марыя Браніславаўна, 1910 г., палячка, у 1932 г. закончыла настаўніцкую семінарыю ў Нясвіжы. З 1933 па 1936 г. працавала настаўніцай, з 1936 г. па сённяшні дзень працуе ў Аддзеле аховы здароўя і аптэк. Яе бацька працуе ў Фінансавым аддзеле і з’яўляецца загартаваным польскім шавіністам. У 1943 г. ён казаў: “Ешчо придёт время когда поляки руских і белоруссов будут резать ножами”. Дачка такога ж палітычнага погляду і настрою”[22].

Архіўныя дакументы сведчаць пра распаўсюджанасць тэндэнцыі да змены нацыянальнасці. Галоўным чынам людзі хадайнічалі пра прызнанне іх прыналежнасці не да польскай, а да беларускай нацыі. У фондах Менскай раённай управы такія заявы захоўваюцца ў некалькіх адзінках захавання[23].

Вялікая ўвага ў правядзенні нацыянальна-культурнай палітыкі акупацыйных уладаў звярталася на фольксдойч. Асобным раздзелам распараджэння № 2 шэфа групы армій “Цэнтр” ад 13 ліпеня 1941 г. прапісана “Абыходжанне з фольксдойч”[24]. У ад.з. 756[25] знаходзім распараджэнне ад 23 верасня 1942 г. Генеральнага камісара Беларусі “Выяўленне, перасяленне і клопат пра фольксдойч”, перапіску рэйхсміністра па кіраванню ўсходнімі тэрыторыямі з рэйхсміністрам “Остланда” па пытанню прыняцця на грамадзянскую службу фольксдойч. Патрабавалася дакладнае вывучэнне звестак пра кожнага, хто падае сваё паходжанне як “фольксдойч”, іх пераправерка і асаблівая асцярожнасць у сумніўных выпадках. Сярод дакументаў ад.з. 381[26] знаходзяцца распараджэнні Рэйхсміністэрства па занятым усходнім абласцям і перапіска з Рэйхскамісарыятам “Остланд” і акруговымі камісарыятамі пра адносіны да фольксдойч, іх правах і заработнай плаце.

Не заставаліся па-за ўвагаю ўладаў і пытанні нацыянальна-культурнага развіцця мусульманскага насельніцтва. Вялікую цікавасць мае

[19] Тамсама. Ф. 393, воп. 5, ад.з. 19.
[20] Тамсама. Ф. 393, воп. 5, ад.з. 20, арк. 68, 69.
[21] ДАМВ. Ф. 1549, воп. 1, ад.з. 34, ад.з. 125 – 128.
[22] Тамсама. Ф. 1549, воп. 1, ад.з. 34, ад.з. 125 (пераклад з расейскай мовы).
[23] Тамсама. Ф. 623, воп. 1, ад.з. 6, ад.з. 516.
[24] НАРБ. Ф. 393, воп. 3, ад.з. 42, арк. 1.
[25] Тамсама. Ф. 370, воп. 1.
[26] Тамсама. Ф. 370, воп. 30.

перапіска Рэйхскамісара “Остланду” з Генеральным камісарам Беларусі пра дзейнасць на беларускай тэрыторыі муфція Шынкевіча, перапіска муфція з кіраўніцтвам Генеральнага камісарыяту пра адкрыццё школ у Менску і Клецку для мусульман, дазвол кіраўніцтва на выкладанне Закона божага ў мусульманскіх школах[27]. У іншых фондах знаходзім ліст Генеральнага камісара Беларусі камісару г.Менска з інфармацыяй пра тое, што “імперскі міністр акупаваных усходніх абласцей праяўляе вялікую цікаўнасць да таго, каб рэлігійнай дзейнасці мусульман не ствараліся ніякія перашкоды. Наадварот, ёй трэба ўсяляк садзейнічаць агульнымі намаганнямі”. Генеральны камісар Беларусі прасіў “усебакова спрыяць адпраўленню рэлігійных абрадаў мусульман у г. Менску, выдаваць неабходны дазвол і прадстаўляць мячэць для мусульманскай рэлігійнай дзейнасці[28].

У ліпені 1943 г. імперскі камісар “Остланда” дазволіў мусульманскаму насельніцтву мець адзін выхадны дзень (за выключэннем тых выпадкаў, калі гэтаму перашкаджаюць асаблівыя ваенна-эканамічныя абставіны) на наступныя святы: Меўлід-Байрам (дзень нараджэння Прарока), Рамазан-Байрам (1 кастрычніка 1943 г.), Курбан-Байрам (8 снежня 1943 г.), Навагодняе свята (Узнясенне ці зыход Прарока, які прыпадаў на 28 снежня 1943 г.). Камісарам раёнаў, абласцей і кіраўнікам прадпрыемстваў, на якіх мусульмане складалі большасць, дазваляўся перанос працоўных дзён на царкоўныя святочныя і выходныя дні па грыгарыянскім ці юліянскім календары[29].

Адным з галоўных накірункаў нацыянальна-культурнай палітыкі нямецкіх акупацыйных уладаў была школьная справа. Шэраг канцэптуальных палажэнняў утрымлівае “Часовы школьны парадак”, надрукаваны ва “Урадавым весніку Генеральнага камісара Беларусі” № 2 ад 13 кастрычніка 1941 г.[30] Сярод іх забарона жыдоўскай адукацыі (“Для жыдоў не ўстанаўліваецца ніякага абавязковага навучання. Жыдоўскія школы нельга арганізоўваць”), развіццё беларускамоўнага навучання (“Выкладанне ў школах будзе на беларускай мове. У мясцовасьцях, якія заселеныя польскаю меншасьцю, павінна быць у школах у кожнай клясе ня менш 6-ці гадзін на тыдзень заняткаў пабеларуску”), выкладанне рэлігіі (“Выкладаньне рэлігіі зьяўляецца не справай дзяржавы, а справай царквы. Я прадастаўляю праваслаўнай беларускай і каталіцкай царквам выкладаньне рэлігіі па-за школай, паводле кіраўнічых зазначэньняў павятовых камісараў. Трэба мець увагу і на магамэтанскую меншасьць. Пры-

[27] Тамсама. Ф. 370, воп. 1.
[28] Тамсама. Ф. 370, воп. 1, ад.з. 433, арк. 2.
[29] Тамсама. Ф. 370, воп. 1, ад.з. 2376, арк. 10.
[30] ДАМВ. Ф. 623, воп. 1, ад.з. 1, арк. 145 – 146 (цытаты на мове арыгіналу).

мус да вывучэньня закону Божага будзе карацца”), забарона польскай прапаганды (“Кожнае злоўжываньне школы ў мэтах агітацыі польскай меншасьці будзе цяжка карацца, бо жыццёвы абшар Беларусі ёсьць перш за ўсё для беларускага жыхарства”) ды інш.

4 кастрычніка 1941 г. Генеральны камісар Беларусі выдаў распараджэнне “Пра стварэнне нямецкіх народных школ”. Яно загадвала “ў абласцях Беларусі, у якіх знаходзяцца дзеці фольксдойч ці дастатковая колькасць дзяцей рэйхсдойч, якія маюць патрэбу ў школьнай адукацыі, тэрмінова вызначыць колькасць нямецкіх вучняў і забяспечыць іх кваліфікаванымі нямецкімі настаўнікамі. Прынцыпова пазбягаць таго, каб дзеці нямецкага паходжання накіроўваліся ў беларускія школы. У агульным выпадку маюцца ўсе падставы для стварэння адной нямецкай школы пры колькасці звыш 10 чалавек нямецкіх дзяцей школьнага ўзросту. Нямецкія школы знаходзяцца пад непасрэдным наглядам абласных камісараў”[31]. Меркавалася ўвесці асобнае навучанне для хлопчыкаў і дзяўчынак.

У ад.з. 58 фонду Гарадзенскага ўезднага камісарыяту[32] знаходзіцца перапіска па праблеме адкрыцця пачатковай школы для дзяцей рэйхсдойч, справаздача інспекцыі народнай школы для рэйхсдойч і народнай школы для фольксдойч у Гародні за 7 ліпеня 1943 г., ліст ад кіраўніцтва Саюза нямецкіх дзяўчат “Остланда” кіраўніку Гарадзенскай акругі з прапановай накіраваць школьную памочніцу для працы ў школе для рэйхсдойч, дакументы адносна адкрыцця школы для рэйхсдойч у Гародні за жнівень 1942 г., спісы вучняў школы для рэйхсдойч, паведамленне школьнай рады аб школе для фольксдойч у Гародні ад 7 жніўня 1942 г. У апошнім дакуменце прыводзіцца апісанне школы і колькасць вучняў, даецца ацэнка ведання вучнямі нямецкай мовы, падрабязна характарызуюцца настаўнікі, прыводзяцца рэкамендацыі і заўвагі па арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Напр., “неабходна клапаціцца пра вывучэнне звычайных нямецкіх дзіцячых песняў, пры гэтым асаблівую ўвагу надаваць нямецкай нацыянал-сацыялістычнай моладзевай песні... Школьныя перапынкі павінны запаўняць нямецкія дзіцячыя гульні. У школе для фольксдойч неабходна прадухіляць любое выкарыстанне не нямецкай мовы”. Таксама ёсць план заняткаў. Апрача гэтых дакументаў, можна пазнаёміцца з матэрыяламі па гісторыі развіцця літоўскіх народных школ за жнівень 1942 – люты 1943 г.

На жаль, адносна іншых нацыянальных груп мы не можам гаварыць пра наяўнасць дастатковай колькасці архіўных матэрыялаў. Толькі

[31] НАРБ. Ф. 370, воп. 1, ад.з. 3, арк. 1.
[32] ДАГрВ. Ф. 1, воп. 1

ў двухадзінках захавання Дзяржаўнага архіва Гарадзенскай вобл. маюцца звесткі па гісторыі цыганоў. Сярод дакументаў – данясенне Скідальскага жандарскага ўчастку пра арышт і расстрэл цыганоў у 1942 г., данясенне бургамістра Гародні ўезднаму камісару пра заключэнне ў мясцовую турму Яна Закшэўскага з жонкаю і трыма дзецьмі за бадзяжніцтва[33], а таксама дакумент пра расправу з групай цыганоў[34].

Для больш грунтоўнага вывучэння гісторыі нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных супольнасцяў Беларусі ў часы нямецкай акупацыі неабходны працяг архіўных пошукаў у іншых архівах Беларусі. Гістарычная рэканструкцыя дазволіць убачыць новыя бакі паўсядзённага жыцця насельніцтва нашай краіны ў гэты складаны перыяд.

Артыкул падрыхтаваны на матэрыялах Нацыянальнага архіва Беларусі, Дзяржаўнага архіва Менскай вобл., Дзяржаўнага архіва Гарадзенскай вобл. Цытаты беларускамоўны дакументаў даюцца з поўным захаваннем моўных асаблівасцяў тэксту.

[33] Тамсама. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 271, арк. 6.
[34] Тамсама. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 100, арк. 43.